пражывае каля дзевяці з паловай мільёнаў чалавек, большая частка — у гарадах.

1. Чаму Беларусь з'яўляецца еўрапейскай краінай?
2. Пералічыце краіны, з якімі мяжуе Беларусь.
3. З якой краінай Беларусь мае самую працяглую мяжу?
4. Колькі чалавек пражывае ў Беларусі?

1. Вызначце працягласць нашай краіны з захаду на ўсход. Выкарыстайце карту на с. 1 атласа.
2. Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь на с. 2 атласа вобласць, у якой вы пражываеце.
3. Даведайцеся пра колькасць насельніцтва ў вашай вобласці і населеным пункце. Выкарыстайце палітыка-адміністрацыйную карту Рэспублікі Беларусь на с. 2 атласа.

## 3. НАШЫ ПРОДКІ

Першы чалавек на тэрыторыі Беларусі з'явіўся ў далёкія-далёкія часы. Ён паступова навучыўся рабіць каме́нныя, а потым жалезныя прылады працы. Людзям стала зручней апрацоўваць дрэва, скуру, будаваць жыллё.

Правообладатель Издательский центр БГУ




Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён
на тэрыторыі Беларусі

Жылі нашы далёкія продкі на берагах рэчак у лясных вёсачках. Яны палявалі на звяроў і аралі зямлю на невялікіх лапіках, якія «адваявалі» ў лесу.

З цягам часу на тэрыторыі сучаснай Беларусі рассяліліся ўсходнеславянскія плямёны. **Племя** — гэта група людзей, якія маюць агульнае паходжанне, сваю мову і месца пражывання. Усходнія славяне — продкі сучасных беларусаў, рускіх, украінцаў.

 Правообладатель Издательский центр БГУ

Правадыром аднаго са славянскіх плямён быў Крыва. Гэтае племя пасялілася на землях ад ракі Нёман да рэк Заходняя Дзвіна і Дняпро. Яно атрымала назву «крывічы́». Лічаць, што такая назва паходзіць ад слова «крэўныя» — гэта значыць людзі, блізкія па крыві.

Частка крывічоў будавала сваё жыллё ў тым месцы, дзе Заходняя Дзвіна злівалася з рэчкай Палатой. У гэтым месцы быў заснаваны самы старажытны горад Беларусі, якому далі назву Полацк. А жыхары тых мясцін сталі звацца палача́намі.

Крывічы мелі такі звычай. Калі юнак дасягаў паўналецця, то, каб звацца сапраўдным мужчынам, яму трэба было прайсці шэраг іспытаў. Ён мусіў пераплысці паўнаводную раку, раскласці вогнішча, упаляваць звера, пералічыць сваіх продкаў да пятага калена. Таго, хто не мог гэтага зрабіць, лічылі здольным да здрады. Яго нават маглі выгнаць з племені.

Яшчэ адно славянскае племя — дрыгавічы́ — пасялілася на правым беразе Дняпра, у вытоку Нёмана і на Прыпяці. Яны займалі землі, дзе было шмат топкіх балот — дрыгвы́. Магчыма, адсюль паходзіць і назва племені. Тут быў пабудаваны старажытны горад Тураў.

На рацэ Сож пасялілася племя радзі́мічаў. Яны пачалі так звацца ад імя свайго правадыра Радзі́ма. Пазней на зямлі радзімічаў узнік горад Гомель.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Разгледзьце карту «Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі» на с. 4 атласа. Пакажыце на ёй тэрыторыю рассялення крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў.

Нашы продкі жылі ў драўляных дамах. Елі простую ежу: хлеб, проса, грэчку, мяса, малако і мёд. Яны былі вельмі гасцінныя. Але, калі было неабходна, са зброяй у руках абаранялі свой дом.

Нашы продкі вылучаліся сілай і працавітасцю. Яны займаліся жывёлагадоўляй, земляробствам. Тагачасныя земляробы сеялі жыта, пшаніцу, ячмень, лён, гарох, боб. Ураджай збіралі рукамі і сярпамі. Атрыманае зерне малолі на муку.



Старажытнае паселішча

 Правообладатель Издательский центр БГУ

У памяць аб супольным паходжанні братніх народаў — беларусаў, рускіх, украінцаў — мы шануем нашу агульную гісторыю.

1. Пералічыце назвы ўсходнеславянскіх плямён, якія лічацца продкамі беларусаў. Раскажыце, адкуль пайшлі іх назвы.
2. Якія выпрабаванні праходзіў юнак-крывіч, калі дасягаў паўналецця? Раскажыце пра гэты звычай.
3. Назавіце заняткі нашых продкаў. Чым яны харчаваліся? Дзе жылі? Выкарыстайце малюнкі ў апавяданні і на с. 4 атласа.

Даведайцеся ў вашых бацькоў ці бабуль і дзядуляў пра іх паходжанне і складзіце невялікае паведамленне аб гэтым.

## 4. ЗЯМЛЯ БЛАКІТНЫХ РЭК І АЗЁР

У Беларусі шмат розных рэк. Сярод галоўных — Дняпро, Прыпяць, Сож, Нёман, Заходняя Дзвіна. Менавіта на іх берагах першапачаткова сяліліся нашы продкі. Людзі падарожнічалі па рэках на лодках і караблях. У час вандровак абменьваліся рознымі рэчамі і прадуктамі харчавання. Большасць гарадоў былі пабудаваны на берагах рэк.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Разгледзьце карту «Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі» на с. 4 атласа. Пакажыце на ёй пералічаныя вышэй рэкі.

У старажытныя часы праз тэрыторыю Беларусі праходзіў вялікі гандлёвы шлях «з вара́гаў у грэкі». Рэкі Заходняя Дзвіна і Дняпро злучалі паміж сабой два моры: Балтыйскае і Чорнае. На берагах Балтыйскага мора жылі вара́гі — продкі сучасных шведаў, нарвежцаў, датчан. А праз Чорнае мора можна было нават трапіць на радзіму Алімпійскіх гульняў — у Грэцыю.



На такіх караблях плавалі па шляху «з варагаў у грэкі»


Правообладатель Издательский центр БГУ




Шлях «з варагаў у грэкі»

Аднак на гэтым шляху была адна перашкода. Не існавала прамога воднага пераходу ад Заходняй Дзвіны да Дняпра. Таму лодкі і караблі цягнулі па зямлі.

Ёсць сярод нашых рэк адна незвычайная. Гэта рака Няміга. У старажытным Мінску яна з'яўлялася своеасаблівай вуліцай-ракой. Па ёй плавалі на чаўнах тагачасныя гарадскія жыхары. Раней яна была шырокая, а потым звузілася і змялела. Сёння яна цячэ ў падземнай трубе пад вуліцай Няміга, што ў Мінску.

Рэкі — гэта блакітныя шляхі Беларусі. Азёры людзі ласкава называюць яе «блакітнымі



Старажытны Мінск і Няміга

 Правообладатель Издательский центр БГУ

вачыма». Сярод самых вялікіх — азёры На́рач, Сві́цязь, Бра́слаўскія. Кожнае возера ўтрымлівае мноства таямніц і загадак. Вось што расказвае **паданне** пра возера Свіцязь на Гродзеншчыне.

У даўніну з блакітных свіцязянскіх хваль чуўся людскі плач. Каб даведацца, хто так жаласна плача, рыбакі закінулі ў ваду сетку. Калі пачалі цягнуць яе ў лодку, з вады паказалася прыгожая дзяўчына з распушчанымі косамі. «Ведайце, — сказала яна, — што возера заўсёды карае тых, хто адважыўся памуціць яго чыстыя воды. Але ў вашых жылах цячэ наша кроў, і таму я адкрыю вам таямніцу.

Калісьці тут, дзе вашы вёслы рассякаюць ваду, стаяў горад Свіцязь. Ім валодаў мой бацька. Аднойчы суседні гаспадар прыслаў майму бацьку пісьмо. У ім ён прасіў дапамогі. На яго напалі ворагі. Бацька сабраў сваіх воінаў. А перад паходам прыйшоў да мяне параіцца. Хто абароніць свіцязянскіх жанчын і дзяцей, калі ён не вернецца дамоў? Я супакоіла бацьку, сказала, што мне сніўся Бог. Ён, міласэрны, і абароніць нас ад бяды.

Бацька рушыў у паход. Аднак ворагі разбілі наша войска і падышлі да Свіцязя. Тады ўсе жыхары яго пакляліся: памром, а не здадзімся ў палон! І раптам горад заліло асляпляльнае святло. Мы заплюшчылі вочы і пачалі падаць на зямлю. Але зямля расступілася пад намі,

Правообладатель Издательский центр БГУ

і замест яе нас прыняла вада». Раскazaўшы гэта, прыгажуня знікла. І больш яе ўжо ніхто не бачыў.

## Карысна ведаць



Адам Міцкевіч

Той, хто хоць адзін раз ступіў на свіцязянскі бераг, абавязкова вяртаецца сюды. Ён жадае зноў убачыць «зоркі над сабою і зоркі пад сабою, і месяцы два побач з імі...». Гэтыя радкі напісаў славуты паэт **Адам Міцкевіч**, які нарадзіўся тут, на Навагрудчыне. Ён з любасцю ў сэрцы слухаў народныя песні і казкі, мясцовыя паданні. І прысвяціў сваёй Радзіме і возеру Свіцязь нямала вершаў. Паэту ўстаноўлены помнікі ў Навагрудку і ў сталіцы нашай краіны.

Разгледзьце карту «Славутыя людзі зямлі беларускай» на с. 14—15 атласа. Пакажыце партрэт Адама Міцкевіча, помнік яму і горад, дзе гэты помнік устаноўлены.

**1.** Раскажыце, якое значэнне мела рака Няміга ў старажытным Мінску. Выкары-


Правообладатель Издательский центр БГУ

стайце малюнак на с. 18 вучэбнага дапаможніка.

2. Чаму азёры называюць «блакітнымі вачыма» нашай зямлі?

3. Што ўразіла вас у паданні пра возера Свіцязь? Што ў ім падаецца неверагодным?

4. Складзіце план пераказу падання пра возера Свіцязь.

Падрыхтуйце кароткае паведамленне пра падарожжа нашых продкаў, усходніх славян, па шляху «з варагаў у грэкі». Выкарыстайце картасхему на с. 17 і фота на с. 16 вучэбнага дапаможніка.

## 5. НАША РАДЗІМА НА ГІСТАРЫЧНАЙ КАРЦЕ

Пра тую ці іншую гістарычную падзею трэба мець дакладнае ўяўленне. Варта ведаць месца, дзе яна праходзіла, і час, калі яна адбылася. Для гэтага нам спатрэбіцца гістарычная карта. Без яе немагчыма ўявіць тэрыторыю, на якой жылі нашы продкі. Карта падкажа гандлёвыя шляхі і напрамкі ваенных паходаў.

Складаць карты людзі пачалі даўно. Яшчэ ў тыя часы, калі ледзь адважваліся выбірацца за межы сваіх населеных пунктаў.

Узор адной са старажытных картаў вы можаце ўбачыць на с. 22 вучэбнага дапаможніка.

Правообладатель Издательский центр БГУ




Старажытная карта

 Правообладатель Издательский центр БГУ

Гістарычныя карты ствараюцца і сёння. На іх наносяцца гарады, якія існавалі ў старажытнасці, абазначаюцца назвы дзяржаў, іх межы. Пазначаецца мноства населеных пунктаў, вялікіх і малых рэчак, а таксама даты гістарычных падзей.

Каб навучыцца «чытаць» гістарычную карту, неабходна ведаць наступныя правілы:

1) кожная карта мае сваю назву, якая адлюстроўвае пэўныя гістарычныя падзеі ў вызначаны час;

2) умоўныя абазначэнні паказваюць напрамкі падарожжаў, ваенных паходаў, месцы бітваў, сталіцы краін і межы паміж дзяржавамі;

3) колеры выкарыстоўваюцца для абазначэння тэрыторый розных дзяржаў.

1. Для чаго прызначана гістарычная карта?
2. Якія правілы трэба ведаць, каб «прачытаць» гістарычную карту?

1. Вызначце заняткі нашых продкаў, адлюстраваныя з дапамогай малюнкаў на старажытнай карце на с. 22 вучэбнага дапаможніка.
2. «Прачытайце» карту «Старажытныя землі Беларусі» на с. 5 атласа. Для гэтага адкажыце на пытанні і выканайце заданні.
1. Якім колерам абазначана Полацкае княства, а якім — Тураўскае? Якое з іх буйнейшае па тэрыторыі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Якім умоўным значком абазначаны на карце галоўныя гарады гэтых княстваў? Які з гэтых гарадоў старэйшы?
3. Як называлася княства, у складзе якога знаходзіўся горад Мінск? Як гучала назва горада ў старажытнасці?
4. Пакажыце на карце шлях «з варагаў у грэкі» ў напрамку з поўначы на поўдзень.

Прачытайце назвы гарадоў і рэк, якія пазначаны на старажытнай карце.

## 6. «СТУЖКА ЧАСУ»

Любую гістарычную падзею можна паказаць з дапамогай «стужкі часу». Гісторыя — гэта і ёсць своеасаблівая «стужка часу», дзе кожная падзея мае сваё месца — пэўную **дату**. Першай датай у гісторыі нашай краіны,




 Правообладатель Издательский центр БГУ

якую мы ведаем дакладна, з’яўляецца **862 год.** Пад гэтым годам упершыню на старонках рукапісных кніг згадваецца старажытны горад Полацк. Гэта дата адносіцца да 9 стагоддзя.

У гісторыі вельмі часта ўжываецца назва **эра**. Пачатак нашай эры звязваюць з нараджэннем **Ісуса Хрыста**. Першы год яго жыцця — гэта першы год нашай эры. Калі падзеі адбываліся да нараджэння Хрыста, то кажуць, што яны адбыліся да нашай эры.

Першыя вядомыя **стаянкі** старажытных людзей з’явіліся на тэрыторыі нашай краіны да нараджэння Ісуса Хрыста. Адбылося гэта **прыкладна 100—35 тысяч гадоў таму.** Мы жывём у пачатку 21 стагоддзя. Гэта значыць, што пасля нараджэння Хрыста прайшло ўжо 20 стагоддзяў нашай эры, або 2 тысячагоддзі. Тысяча гадоў, ці дзесяць стагоддзяў, складаюць тысячагоддзе.




Правообладатель Издательский центр БГУ 